ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

*№ 3 (1016)* | *АЎТОРАК, 12 лютага 2002 г.* | *Газета заснавана ў верасні 1969 года* | *Выходзіць два разы ў месяц* | *Цана дагаворная*

## НАВУЦЫ – ПАСКОРАНАЕ І ЭФЕКТЫЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Арганізацыя і правядзенне святкавання Дня беларускай навукі сёлета былі ўскладзены на наш універсіт.. І можна сказаць без перабольшвання: уся праграма прайшла на высокім узроўні. А ўрачыстасць па традыцыі праходзіла ў абласным драматычным тэатры.

З дакладам выступіў старшыня Савета рэктараў Гомельскай вобласці, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, рэктар ГДУ імя Ф.Скарыны прафесар М.В.Селькін. Увагу навукоўцаў ён засяродзіў перш за ўсё на тых праблемах, якія абмяркоўваліся напярэдадні свята на рэспубліканскай нарадзе з удзелам кіраўніка краіны А.Р.Лукашэнкі па рэфарміраванню акадэмічнай сістэмы і ўсёй навукі ў цэлым з мэтай хутчэйшага ўкаранення яе даследаванняў у практыку і павышэння эканамічнай эфектыўнасці.

Цэнтральнае месца ў дакладзе было адведзена адлюстраванню тых поспехаў, якіх дасягнулі за мінулы год гомельскія інстытуты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, іншыя навукова-даследчыя падраздзяленні і праектна-канструктарскія арганізацыі, вышэйшыя навучальныя ўстановы.

У дакладзе былі пастаўлены таксама пытанні, якія патрабуюць навуковага падыходу і неадкладнага вырашэння.

Ад імя абласных выканаўчага камітэта і Савета дэпутатаў навукоўцаў Гомельшчыны з прафесіянальным святам цёпла павіншаваў старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкі. Ён жа ўручыў групе ўзнагароджаных Ганаровыя граматы аблвыканкама і абласнога Савета дэпутатаў, а таксама дыпломы і прэміі аблвыканкама пераможцам абласнога конкурсу маладых вучоных і спецыялістаў 2001 года.



З дакладам выступае М.В.Селькін.

Фота У.Чысціка.



Сваю місію па віншаванню са святам і ўручэнню ўзнагарод выканалі старшыня гарвыканкама Л.В.Барабанаў і старшыня гарадскога Савета дэпутатаў У.С.Чарнаштан, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення прафесарскага сходу С.В.Шчарбакоў, старшыня абкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі У.Я.Курылаў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы цёпла віталі вядучых вучоных ВНУ вобласці, якім на бягучы навучальны год назначаны персанальныя надбаўкі да службовых акладаў, а таксама юбіляраў 2001 года.

Святочная вечарына завяршылася канцэртам, з якім выступілі лепшыя калектывы і выканаўцы нашага універсітэта.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## УДАСТОЕНЫ ГАНАРОВЫХ ДЫПЛОМАЎ

Групе вядучых вучоных Беларусі за вялікі ўклад у развіццё супрацоўніцтва і ў сувязі з 30-годдзем Міжнароднай школы-семінара па актуальных праблемах фізікі часціц уручаны Ганаровыя дыпломы Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (г.Дубна). Сярод удастоеных гэтай узнагароды – рэктар нашага універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар **М.В.СЕЛЬКІН** і загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар **М.В.МАКСІМЕНКА**.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці прарэктар па навуковай рабоце нашага універсітэта доктар тэхнічных навук, прафесар **ЛІН Дзмітрый Рыгоравіч** узнагароджаны Ганаровай граматай аблвыканкама.

* * *

За вынікі ў прафесійнай дзейнасці, заслугі ў развіцці навукі ў галіне оптыкі і акустыкі Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў узнагароджаны дацэнт кафедры агульнай фізікі нашага універсітэта **ХАХОМАЎ Сяргей Анатольевіч**.

* * *

За шматгадовую добрасумленную працу, плённую навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з Днём беларускай навукі загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі нашага універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук **СЕМЯНЧУК Уладзімір Мікалаевіч** узнагароджаны Ганаровай граматай гарвыканкама.

* * *

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана ст. выкладчык кафедры ЭІ і АСК **АСЯНІНА Таццяна Іванаўна**.

* * *

За шматгадовую плённую працу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана вядучы інжынер-матэматык ІВЦ **ВІШАНКОВА Антаніна Альбертаўна**.

* * *

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ст. выкладчык кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці **ДЗЕЛІДОВІЧ Людміла Пятроўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

* * *

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту **МАРОЗАВА Любоў Мефодзьеўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Яго першае пасяджэнне ў новым годзе адбылося ў апошні дзень студзеня. Галоўным на парадку дня стаяла пытанне аб выніках навукова-даследчай работы ГДУ ў 2001 годзе. Са справаздачай выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін. У прынятай пастанове прадугледжаны меры па далейшай актывізацыі і павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў ва ўсіх універсітэцкіх падраздзяленнях.

Па інфармацыях прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С.Ф.Каморнікава зацверджаны план выдання навукова-метадычнай літаратуры на бягучы год і апавешчаны вынікі II Рэспубліканскага конкурсу творчых работ студэнтаў па грамадскіх навуках "Беларусь у XXI стагоддзі".

Савет унёс змяненні ў Статут універсітэта, вырашыў кадравыя і некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ЛАЎРЭАТЫ ФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА

Падведзены вынікі трэцяга тура II Рэспубліканскага конкурсу творчых работ студэнтаў па грамадскіх навуках "Беларусь у XXI стагоддзі".

Гэты конкурс праводзіўся спецыяльным Фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у рамках мэтавай праграмы "Грамадазнаўству XXI стагоддзя – ініцыятыву і творчасць таленавітай моладзі Беларусі".

Сярод пераможцаў конкурсу – пяць студэнтаў нашага універсітэта. Гэта чацвёртакурснікі спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" **Сяргей Каморнікаў** і **Святлана Лін**, студэнт трэцяга курса **Яўген Запладнюк**, пяцікурснікі **Вераніка Брылёва** і **Дзмітрый Міхайлаў** з юрыдычнага факультэта. Яны ўдастоены нагрудных знакаў "Лаўрэат спецыяльнага Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў" і грашовых прэмій у памеры па 150 тыс. руб. Адпаведныя прэміі прысуджаны і іх кіраўнікам: прафесару кафедры эканамічных тэорый **М.В.Навучыцелю**, загадчыку гэтай кафедры **Б.У.Сарвіраву**, дэкану юрыдычнага факультэта **Ю.А.Ключнікаву**, загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права **Н.В.Капытковай**.

## ЗА ВЫДАТНУЮ ВУЧОБУ

У залікоўцы студэнта 4 курса спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" эканамічнага факультэта Сяргея Каморнікава толькі выдатныя адзнакі. Вышэйшымі баламі былі ацэнены яго адказы і на экзаменах прайшоўшай у студзені зімовай сесіі. За дасягнутыя поспехі Сяргей у чарговы раз удастоены Прэзідэнцкай стыпендыі.

## РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

Савет жанчын універсітэта аб'яўляе конкурс сярод студэнтаў на лепшыя празаічныя творы, вершы, прысвечаныя самаму дарагому для ўсіх нас чалавеку – Маці. Конкурс прымяркоўваецца да свята 8 Сакавіка – Дня жанчын. Літаратурныя спробы прыносьце ў рэдакцыю газеты "Гомельскі універсітэт" да 28 лютага г.г. Лепшыя з іх будуць апублікаваны, пераможцы – заахвочаны.

* * *

Адраджаецца добрая традыцыя, якая даўно нарадзілася ва універсітэце, дзякуючы членам жансавета ГДУ, але па розных прычынах і абставінах была незаслужана забыта. Мабыць, многія памятаюць цікавыя выстаўкі, на якіх дэманстравалі сваю разнастайную творчасць – дэкаратыўна-прыкладную, кулінарную – жанчыны, члены універсітэцкага калектыву. Яны запрашаюцца пазнаёміць са сваімі здольнасцямі і сёлета ў выставачнай зале галоўнага корпуса 5 сакавіка.

Экспанаты неабходна прадставіць у музей-лабараторыю Ф.Скарыны 4 сакавіка з 9 да 17 гадзін. Пераможцаў конкурсу чакаюць прызы.

## ПЕРАМОЖЦА КОНКУРСУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ

Цяперашні пяцікурснік фізічнага факультэта Андрэй Еўтухоў (навуковы кіраўнік – к.ф.-м.н., дацэнт С.В.Шалупаеў) прыняў удзел у конкурсе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на лепшую навуковую студэнцкую работу. Яго даследаванне было прысвечана лазерным метадам апрацоўкі металаў і сплаваў. Андрэй стаў адным з шасці па рэспубліцы пераможцаў гэтага конкурсу і ўдастоены адпаведнага дыплома і грашовай прэміі.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры беларускай культуры ПАЛУЯН Алену Мікалаеўну (навуковы кіраўнік – дацэнт Д.Д.Паўлавец) з паспяховай абаронай на спецыялізаваным Савеце пры ГДУ дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.*

## САПЕРНІЧАЛІ ЮНЫЯ ЭКОЛАГІ

У гомельскай СШ № 56, якая з'яўляецца базавай нашага універсітэта, у студзені прайшлі VI абласны конкурс навуковых біёлага-экалагічных работ і абласная навукова-экалагічная канферэнцыя школьнікаў "Моладзь і экалагічныя праблемы сучаснасці". У ёй прынялі ўдзел таксама члены дзіцяча-юнацкага цэнтра "Гарызонт" з г.Процвіна Маскоўскай вобласці.

На пленарным пасяджэнні выступілі прарэктар па навуковай рабоце нашага універсітэта прафесар Д.Р.Лін і загадчык кафедры экалогіі дацэнт А.М.Кусянкоў.

На канферэнцыі працавала 5 прадметных секцый, большасцю з якіх кіравалі вучоныя ГДУ. Было заслухана і абмеркавана звыш 70 навуковых дакладаў юных экологаў. За лепшыя навуковыя работы і даклады іх аўтарам уручаны ўзнагароды.

# О КОМПЛЕКСНОЙ КОНТРОЛЬНОЙ РАБОТЕ РЕКТОРАТА В 2001 ГОДУ

В последние годы аналитики высшего образования слово «качество» повторяют чаще других. Отслеживание качества актуально и для нашего университета. С целью выявления уровня общепрофессиональной и специальной подготовки студентов стало доброй традицией проведение комплексной контрольной работы ректората (ККРР). Данная форма контроля позволяет проследить, как протекает процесс усвоения учебного материала, вырабатываются необходимые умения и навыки, осуществляется планирование и рефлексия учебно-познавательной деятельности студентов.

Кроме того, в этом учебном году преследовались и чисто прагматические цели: проверить уровень подготовки студентов тех специальностей, которые впервые выходят на государственные экзамены (специальности «Финансы и кредит», «Коммерческая деятельность», «Психология», «Физическая электроника»); разобраться в причинах тревожности у студентов-филологов, возникающей из года в год при изучении и сдаче дисциплин «Историческая грамматика русского языка» и «Белорусская литература XX века»; проанализировать причины низкой успеваемости по некоторым учебным курсам на юридическом факультете.

ККРР была проведена в ноябре 2001 года на 5 факультетах по 7 специальностям и 14 дисциплинам. Результаты ее, представленные в таблице, проанализированы на заседании научно-методического совета (НМС) университета. Отмечено, что ККРР в целом прошла организованно в соответствии с графиком. Студенты были заранее оповещены и ознакомлены с вопросами, выносимыми на контрольную работу. Многие руководители факультетов и кафедр, большинство преподавателей ответственно подошли к проведению работы, проявили готовность совершенствовать систему контроля за качеством подготовки специалистов.

Обобщенные количественные данные ККРР позволяют сделать следующие выводы. Достаточно высокий уровень обученности выявлен на юридическом и экономическом факультетах, а также на факультете психологии и довузовской подготовки. С хорошим багажом знаний на первые государственные экзамены выходят студенты специальностей «Физическая электроника», «Финансы и кредит», «Коммерческая деятельность», «Психология». Высокая требовательность преподавателей на курсовых экзаменах, целенаправленная работа деканата по совершенствованию учебного процесса и укреплению дисциплины на юридическом факультете нашли отражение в результатах ККРР. По дисциплинам «Уголовный процесс» и «Уголовное право» более 80% студентов-юристов получили оценки «отлично» и «хорошо».

При подведении результатов ККРР НМС университета отмечены недостатки, которые в какой-то мере сказались на результатах и эффективности самой работы. Прежде всего требует совершенствования регламент проведения ККРР и методика подведения итогов. Кроме того, на ряде специальностей проведение и проверка контрольных работ поручались тем преподавателям, которые вели занятия и принимали курсовые экзамены по проверяемым дисциплинам. Такая практика наводит на мысль, что контрольная работа здесь проводилась не потому, что надо было что-то проверить, а потому, что так приказало начальство. Подтверждением этому является и тот факт, что не на всех факультетах сделан глубокий анализ результатов ККРР, не вскрыты причины низкой успеваемости студентов.

Прокомментируем некоторые итоги ККРР на филологическом факультете. На специальности «Русский язык и литература» работы выполняли 65 (из 73) студентов по двум дисциплинам: «Историческая грамматика русского языка» и «Русская литература». Результаты по исторической грамматике несколько настораживают: средний балл на контрольной работе оказался на 0,8 балла выше, чем средний балл соответствующего курсового экзамена; на контрольной работе неудовлетворительных оценок не оказалось, а на курсовом экзамене их было 14. По результатам курсового экзамена большая группа студентов была вынуждена либо покинуть университет, либо перевестись на заочный факультет. В такой ситуации напрашиваются два вывода: либо контрольная работа оценена необъективно и ее результаты завышены, либо на курсовом экзамене к студентам предъявлялись чрезмерные требования. По-видимому, имело место и первое, и второе. Первое потому, что сам преподаватель, читающий курс, проводил контрольную работу и выставлял оценки (в нарушение приказа ректора). Второе связано, по-видимому, с перегрузкой содержания учебного курса, полным отсутствием методического обеспечения дисциплины. Методическому совету факультета (декан В.А.Бобрик), кафедре русского, общего и славянского языкознания (заведующий В.И.Коваль) поручено разработать план конкретных мероприятий, направленных на совершенствование качества преподавания «Исторической грамматики русского языка» на факультете.

Параллельно ККРР с целью получения сведений об отношении студентов к изучаемым дисциплинам на филологическом факультете (специальность «Русский язык и литература») проводился опрос (выборка 65 человек). Студентам предлагалось из 16 дисциплин назвать те, которые изучаются с интересом, и те, которые вызывают большие трудности и усваиваются без интереса. При ответе на первый вопрос отмечены дисциплины «Психология» (преподаватели Гатальская Г.В., Заулина Г.В.); «Русская литература» (преподаватели Усольцева Т.Н., Морозова И.И.); «Современный русский язык» (преподаватели Кобыш И.И., Ничипорчик Е.В.). Абсолютно неинтересны для будущих филологов «Русская диалектология» и «Историческая грамматика русского языка». При ответе на второй вопрос (трудно и неинтересно) с отрывом лидируют те же дисциплины: «Историческая грамматика русского языка» и «Русская диалектология». Часто студентами отмечаются «Латинский язык» и «Иностранный язык».

Результаты опроса не явились новыми для деканата и кафедр филологического факультета. Однако настораживает то, что на протяжении последних нескольких лет такое положение не изменяется. Более того, с каждым годом интерес студентов к отмеченным учебным курсам падает, а трудности их усвоения нарастают. В связи с указанными тенденциями НМС университета предложено ряду кафедр при утверждении учебной нагрузки преподавателей рассматривать вопрос о ее перераспределении и закреплении за другими преподавателями.

В первую очередь излагаемое выше касается кафедры белорусской литературы (заведующий Штейнер И.Ф.). По мнению НМС университета, результаты ККРР на специальности «Белорусский язык и литература» по дисциплине «Белорусская литература XX века» (доцент В.П.Коваленко) являются неудовлетворительными. Вызывает беспокойство уровень обученности студентов: на контрольной работе ни один студент не получил оценку «отлично», а более 70% получили оценку «удовлетворительно» и «неудовлетворительно». Особенно удручающе это выглядит на фоне напряженных, порой придирчивых отношений преподавателя к студентам.

НМС университета отмечена необходимость организации параллельного анкетирования для выяснения отношения студентов к изучаемым дисциплинам и определения причин низкой успеваемости. Проведенное уже в этом учебном году изучение мотивов учебно-познавательной деятельности студентов и ее успешности (выборка 195 человек) позволили выявить следующее. Для сильных студентов характерна внутренняя мотивация: они имеют потребность в освоении профессии на высоком уровне, ориентированы на получение прочных профессиональных знаний и практических умений. Учебные же мотивы слабых студентов в основном внешние, ситуативного характера: избежать осуждения и наказания за плохую учебу, не лишиться стипендии. Вызывает беспокойство низкий уровень мотивации на будущую профессию на педагогических специальностях.

Среди причин, мешающих учиться лучше, доминирует слабая организация самостоятельной работы студентов. Слово «студент» означает усердно занимающийся, усердно работающий и указывает на сущность учебной деятельности в высшей школе, где не столько учат, сколько помогают учиться, самостоятельно приобретать знания, заниматься самообразованием и самовоспитанием. В то же время результаты опроса свидетельствуют о том, что далеко не все студенты работают в полную меру. Лучшие из них занимаются по 5-6 часов в день, но таких только 11%. Самостоятельно работают ежедневно до 3-х часов около 50%; отсутствует вовсе самостоятельная работа либо ей уделяется менее одного часа в день у 19% опрошенных. Нерегулярная работа студентов во многом и приводит к низкой успеваемости.

ККРР проведена, итоги ее подведены. Главный из них очевиден: далеко не все сделано каждым студентом и преподавателем по развитию внутренней мотивации учебно-познавательной деятельности, формированию умений и навыков самостоятельной работы, совершенствованию технологий и методик преподавания, обучения и оценки. Для руководителей структурных подразделений итоги ККРР должны быть использованы не для принятия каких-либо репрессивных мер, а носить только стимулирующий характер в качественном изменении отношения студентов к учебной деятельности, а преподавателей — к учебному процессу.

**С.КАМОРНИКОВ,**
**проректор по учебной работе, профессор;**
**Л.ЕРМАКОВА,**
**заместитель председателя НМС университета, доцент кафедры педагогики.**

*Таблица*

**Сводные данные итогов ректорской комплексной контрольной работы в 2001-2002 учебном году**

| № п/п | Наименование дисциплины | Ф.И.О. преподавателя | Курс, специальность | Кафедра | Число студентов | | Оценки в % | | | | Средний балл |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | по списку | участвовало | отл. | хор. | удовл. | неуд. | |
| 1. | Историческая грамматика русского языка | Козлова Р.М. | 3 курс, русский язык и литература | Русского, общего и славянского языкознания | 73 | 65 | 15,4 | 60 | 24,6 | – | 4,3 |
| 2. | Русская литература | Усольцева Т.Н. | 3 курс, русский язык и литература | Русской литературы | 73 | 65 | 21,5 | 43,1 | 32,3 | 3,1 | 4 |
| 3. | Белорусская литература XX века | Коваленко В.П. | 5 курс, белорусский язык и литература | Белорусской литературы | 55 | 51 | – | 27,4 | 62,8 | 9,8 | 3,1 |
| 4. | Современный белорусский язык | Бобрик В.А. | 5 курс, белорусский язык и литература | Белорусского языка | 55 | 51 | 19,6 | 19,6 | 53 | 7,8 | 3,5 |
| 5. | Уголовный процесс | Слукина Е.С. Цыкунова И.Н. | 4 курс, правоведение | Уголовного права и процесса | 108 | 86 | 40,7 | 44,2 | 15,1 | – | 4,2 |
| 6. | Гражданский процесс | Грищенкова Н.Г. Тарасова Н.А. | 4 курс, правоведение | Гражданско-правовых дисциплин | 108 | 89 | 53,9 | 28,1 | 15,7 | 2,3 | 4,3 |
| 7 | Радиофизические методы измерения | Инспекторов Э.М. | 5 курс, физическая электроника | Физическая электроника | 25 | 22 | 13,6 | 45,4 | 41 | – | 3,7 |
| 8. | Техника СВЧ и КВЧ | Кондратенко В.И. | 5 курс, физическая электроника | Физическая электроника | 25 | 22 | 13,6 | 45,4 | 41 | – | 3,7 |
| 9. | Психодиагностика | Лытко А.А. | 4 курс, психология | Психологии | 29 | 22 | 23 | 41 | 27 | 9 | 3,7 |
| 10. | История психологии | Файферман В.В. | 4 курс, психология | Психологии | 29 | 22 | 50 | 31,8 | 9,1 | 9,1 | 4,2 |
| 11. | Финансы предприятий | Кобринский Г.Е. | 5 курс, финансы и кредит | Финансы и кредит | 27 | 24 | 45,8 | 54,2 | – | – | 4,4 |
| 12. | Теория финансов | Войтишкина А.Л. | 5 курс, финансы и кредит | Финансы и кредит | 27 | 24 | 45,8 | 33,3 | 20,9 | – | 4,2 |
| 13. | Управление оптовыми фирмами | Богданов М.И. | 5 курс, коммерческая деятельность | Экономической информатики и автоматизированных систем управления | 24 | 21 | 47,6 | 9,5 | 28,6 | 14,3 | 3,6 |
| 14 | Товароведение промышленных и продовольственных товаров | Кругляков Г.Н. | 5 курс, коммерческая деятельность | Экономической информатики и автоматизированных систем управления | 24 | 21 | 28,6 | 33,3 | 38,1 | – | 3,6 |

Тры дзесяцігоддзі наш універсітэт плённа супрацоўнічае з Аб'яднаным інстытутам ядзерных даследаванняў (г.Дубна), праводзіць сумесныя заняткі ў Міжнароднай школе-семінары "Актуальныя праблемы фізікі часціц". У лабараторыі высокіх энергій ГДУ пры ўдзеле супрацоўнікаў гэтай буйнейшай навуковай установы праводзяцца даследаванні па апрацоўцы паскаральнікаў інфармацыі, атрыманай у АІЯД і Еўрапейскім цэнтры ядзерных даследаванняў (г.Жэнева).

Заканамерна, што доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі М.В.Максіменка быў адным з навуковых прадстаўнікоў г.Гомеля, запрошаных на сесію Вучонага савета АІЯД, якая праходзіла 17-18 студзеня г.г. і была прысвечана тэме "Беларусь у АІЯД".



*НА ЗДЫМКУ: прафесар М.В.Максіменка (на пярэднім плане) і дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі В.В.Андрэеў за абмеркаваннем вынікаў навуковых даследаванняў па апрацоўцы паскаральнікаў інфармацыі.*

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

***На падставе рашэння Савета універсітэта ад 31 студзеня 2002 г. па выніках зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі 2001-2002 навучальнага года назначаны стыпендыі:***

**ІМЯ Я.КАРСКАГА**

**КУПО Алене** — студэнтцы 4 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова".

**ІМЯ П.БРОЎКІ**

**БРЫЛЁВАЙ Вераніцы** — студэнтцы 5 курса юрыдычнага факультэта спецыяльнасці "Правазнаўства".

**ІМЯ А.С.ПУШКІНА**

**ЯСЬКОВУ Дзмітрыю** — студэнту 4 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Руская мова і літаратура".

**ІМЯ Я.КУПАЛЫ**

**ФІЛІМОНАВАЙ Наталлі** — студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура".

**ІМЯ К.КРАПІВЫ**

**СІМАНЕНКУ Дзмітрыю** — студэнту 4 курса матэматычнага факультэта спецыяльнасці "Матэматыка".

**ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**ЛІН Святлане** — студэнтцы 4 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве".

**ЕЎТУХОВУ Андрэю** — студэнту 5 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці "Фізіка" (вытворчае аддзяленне).

**БАЙКОВУ Сяргею** — студэнту 4 курса факультэта фізічнай культуры.

**ІМЯ М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАГА**

**АРЛОВАЙ Аліне** — студэнтцы 4 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве".

**АБРАМЕНКА Алене** — студэнтцы 4 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя".

(фінансуецца Рэчыцкім раённым выканаўчым камітэтам дадаткова да вучэбнай стыпендыі).

**АДМІНІСТРАЦЫІ СЭЗ "ГОМЕЛЬ-РАТОН"**

**(з 1 сакавіка па 30 чэрвеня 2002 года)**

**АСЯНІНАЙ Ірыне** — студэнтцы 5 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве".

НОВАЯ ПАСЛУГА АШЧАДБАНКА

## З МАКСІМУМАМ ВЫГОД

Тыя, хто атрымлівае пенсію ў паштовых аддзяленнях па месцу жыхарства, часта сутыкаюцца з праблемай несвоечасовай выплаты грошай. Даводзіцца прыходзіць на пошту неаднойчы, праводзіць нямала часу ў стамляльным чаканні, што адмоўна адбіваецца на нярвовай сістэме, на планаванні ўласнага сямейнага бюджэту.

Каб пазбегнуць такіх сітуацый, пенсіянерам, якія працуюць у ГДУ, аддзяленне № 321/154 АСБ "Беларусбанка" па вул.Савецкай, 98, што абслугоўвае універсітэт, прапануе новы від паслуг: **АДКРЫЦЦЁ ПЕНСІЙНАГА ЎКЛАДУ ПАД 32% ГАДАВЫХ.** Як і зарплату, пенсію тут можна будзе атрымліваць без праблем, таму што ў банку грошы заўсёды ў наяўнасці.

Для адкрыцця пенсійнага ўкладу неабходна прадставіць пенсійнае пасведчанне і пашпарт. Пасля афармлення ўкладу трэба паведаміць нумар свайго рахунку ў аддзяленні 321/154 у райсабез і ваша пенсія будзе пералічвацца ў ашчадбанк.

## ПРАФУЗНОСЫ — НАЯЎНЫМІ

Як вядома, пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1804 ад 14 снежня 2001 г. "Па абароне правоў членаў прафсаюзаў" адменены безнаяўны пералік прафсаюзных узносаў праз бухгалтэрыю.

Савет Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў даслаў 17 студзеня ў Канстытуцыйны суд зварот, у якім патрабаваў правесці праверку прынятай урадам пастановы на прадмет яе адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

А пакуль у прафсаюзнай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ ідзе збор членскіх узносаў па ведамасцях, як гэта практыкавалася шмат гадоў назад. Адзін працэнт заработнай платы члены прафсаюза аддаюць цяпер асабіста праформам падраздзяленняў, кафедр, ставяць у ведамасці свой подпіс. Тым, хто адмаўляецца плаціць узносы і не жадае заставацца надалей членам прафсаюзнай арганізацыі, неабходна напісаць заяву ў прафкам ГДУ з просьбай выключыць іх з гэтай грамадскай арганізацыі. Пасля гэтага ўжо не варта разлічваць на аказанне матэрыяльнай дапамогі да юбілейных дат, у выпадку хваробы, смерці блізкіх, на атрыманне дзіцячых навагодніх падарункаў, якія аплачваюцца з прафсаюзнага бюджэту. Камісія па працоўных спрэчках пры прафкаме не будзе таксама абараняць інтарэсы работніка, які выбыў з ліку членаў прафсаюза, пры ўзнікненні паміж ім і адміністрацыяй спрэчных пытанняў, якія датычаць заканадаўства аб працы, выдзялення жылля і інш.

АРХЕОЛОГИЧЕСКАЯ ПРАКТИКА ГЛАЗАМИ СТУДЕНТА

## НЕ ТОЛЬКО РОМАНТИКА...

Если ты, читатель, собрался на археологические раскопки, не имея ни опыта, ни здоровья, ни желания работать (а такое бывает нередко), мой тебе совет — откажись. Романтика и жажда приключений отступают после 2-3-х часов работы с лопатой или 7-ми часов беготни по полевой кухне. Под силу и по душе такое только энтузиасту... Но если ты не просто читатель, а студент-историк, для которого прохождение археологической практики является обязательной частью летней сессии, то избежать ее можно лишь одним способом — предоставив увесистый том справок, подтверждающих твою нетрудоспособность.

Итак, прошлым летом первый курс студентов под руководством преподавателей О.А.Макушникова и И.Ю.Уварова отправились на раскопки средневековых курганов в окрестности д.Шарпиловка, что в 58-ми км от Гомеля. По прибытии обнаружилось, что место разбивки лагеря — довольно живописный луг, окруженный с одной стороны лесом, с другой — небольшой лощиной и озером Бобровое. Правда, бобров так никто из нас не видел, зато каждую ночь отход ко сну сопровождался громким кваканьем его постоянных обитателей.



Первый день практики был посвящен разбивке лагеря и установке палаток. Со второго — начались наши трудовые будни. Часть студентов, прихватив лопаты, вместе с О.А.Макушниковым отправлялась на курганы, а часть — под руководством И.Ю.Уварова — оставалась благоустраивать лагерь. Кроме того, команда из повара Ивана Семыкина, его помощницы (автора статьи) и пятерых дежурных занималась приготовлением пищи на 60 человек. Кухней у нас назывались два костра, разделочный стол и палатка для хранения продуктов. Недалеко находились сбитые из досок столы и скамейки — студенческая столовая под открытым небом. Вообще, лагерь был довольно хорошо обустроен. Кроме столовой был сооружен умывальник — закрепленные на досках горлышком вниз пластиковые бутылки. Криничку, откуда бралась питьевая вода, студенты углубили и выложили поленьями наподобие сруба. Спуски к воде были ступенчатыми и поддерживались деревянными опорами. Много сил и времени парни затратили на обустройство купальни. Когда пошли дожди, ко всем шедеврам студенческого плотничьего искусства добавилась еще одна конструкция — каркас в виде небольшого домика с крышей из полиэтиленовой пленки. Он защищал огонь от дождя, а его опорные доски использовались в качестве скамеек вокруг костра. В команду плотников входили С.Перевозников, Д.Рамашка, С.Кудравец, В.Литаш, Д.Ющенко, Д.Грушко, Н.Руцкий.



Многие студенты выполняли конкретные поручения. Денис Ющенко исполнял обязанности командира лагеря. Его первым помощником были Денис Рамашка и Елена Дашкевич. Должность завхоза занимал Николай Руцкий. Он с блеском справился со своей работой — рассчитывать и экономить продукты. Кроме того, Николай был командиром ночных дежурств. Первую помощь заболевшим студентам (в основном при простудах и солнечных ожогах) оказывала Наташа Курзина. Пригодилось здесь и медицинское образование Игоря Юрьевича Уварова. Что касается работы кухни, то организована она была неплохо. Хоть пища была не слишком разнообразной, зато по возможности хорошо приготовленной, а иногда даже вкусной.

Но студенты не были бы студентами, если бы полностью отдавали себя лишь работе. Приятно разнообразили обычный досуг культурно-массовые мероприятия (футбол, волейбол, гитара, чтение книг). Так, незадолго до окончания практики Денис Ющенко и Элеонора Сорокина организовали двухдневную развлекательную программу. С помощью анкетирования были выявлены «самые-самые» (красивые, загорелые, сексуальные и т.д.) представители (представительницы) обоих полов. По совпавшим кусочкам бумаги выбрана лучшая пара — Андрей Сусло и Наташа Биран. Исходя из анкетных данных, определился также «мистер Шарпиловка — 2001». Им стал Сергей Перевозников. На звание «мисс Шарпиловка» он выбрал Олю Винникову.

В борьбу за первенство в археологическом лагере было предложено вступить и преподавателям. Оружие — лук и стрелы, цель — пластиковая бутылка на расстоянии 7-8 метров. Победу одержал Олег Анатольевич Макушников. Его призом стала шикарная «восточная дева», роль которой с блеском исполнил все тот же С.Перевозников. Перед победителем и зрителями И.Семыкин и С.Мигун устроили показательное сражение на мечах — настоящий гладиаторский бой XXI века. На это стоило посмотреть, тем более, что из одежды на гладиаторах были только юбки из осоки. На следующий день была разыграна довольно жуткая, однако хорошо поставленная сцена — «сожжение грешника инквизицией». Красные балахоны и кресты придавали представлению пугающую правдоподобность.

Проведенное на археологической практике время не прошло даром. Каждый увозил с собой кусочек чудесного полесского лета, южный загар и незабываемые воспоминания о почти трех неделях такой трудной и такой интересной практики.

**Елена ЯКУТОВИЧ,**
**студентка гр. И-22 исторического факультета.**

ДУХОВНАЯ ПАЛИТРА

## В ПОИСКЕ ВЫСОКОЙ ИСТИНЫ

***Одна за одной сменяются экспозиции в выставочном зале нашего университета. И каждый раз, знакомясь с многожанровыми работами молодых, но заявивших о себе художниках, и еще только начинающих, уходишь отсюда с наилучшими чувствами, с просветленной душой.***

***Так было и после персональной выставки картин молодого гомельчанина Виктора Данильчика, который впервые вынес на суд зрителей свои художественные работы. Об их ценности, значимости свидетельствуют многочисленные отзывы посетителей, в том числе и этот, публикуемый ниже, который принадлежит доценту кафедры философии, кандидату философских наук Т.П.ГАРАНИНОЙ:***

– Только человек с прекрасной душой мог подарить такую выставку… Поиск общей идеи, поиск высокой истины, поиск самого себя прослеживается во всем творчестве Виктора Данильчика. Философские размышления о смысле жизни приглашают к диалогу. Есть над чем подумать, о чем поспорить. В этом особая значимость выставки для студенческой молодежи. Какую выбрать жизнь? Вот что волнует молодого художника. Две замечательные картины, подаренные с любовью детям на благотворительной елке, проявление человеческого в человеке.

Истоки человечности Виктора в его любви к матери, отцу, девушке, близким людям, родной улице и, конечно же, к белорусской природе. Пейзажи Данильчика не могут не волновать. И невольно вспоминаются поэтические строки Ф.И.Тютчева:

*Не то, что мните вы, природа:*
*Не слепок, не бездушный лик –*
*В ней есть душа, в ней есть свобода,*
*В ней есть любовь, в ней есть язык…*

Выставка очищает и возвышает каждого, кто прикоснулся к ней. Уходишь с нее с осознанием того, что человек может достичь своего совершенства, только работая для усовершенствования других людей, своих современников, во имя их блага…




А сам молодой художник честно признался:

– Благодаря искусству, я увидел то, чего не видел раньше, услышал то, что не слышал раньше, оно открыло мне такие просторы, о которых я раньше и не подозревал.

